Ехаў казачнік Бай
Цераз сёлы і гай.
— Баіць ці не?
— Бай!

*Максім Танк.*

# СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ



Правообладатель Национальный институт образования

## ЯК НЯХІТРЫ ХІТРАГА ПЕРАХІТРЫЎ




— Лянок! Я чытаю кнігу «Беларускія народныя казкі». А ты любіш чытаць казкі? — запыталася Васілінка.

— Так, люблю, — адказаў Лянок. — Я заўважыў, што паводзіны жывёл не заўсёды адпавядаюць павадкам дзікіх і свойскіх звяроў і птушак.

Ці згодны вы з Лянком?

За-сму-ці́ў-ся — *рус*.: огорчился.
Ра-зя́ў-ле-ны (рот) — адкрыты.



Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце назву казкі. Што вы ведаеце пра лісу? Пра гусака? Прачытайце казку «Лісіца і Гусак» і раскажыце, што яшчэ вы даведаліся пра іх.

## Лісіца і Гусак

*Беларуская народная казка*

Неяк Лі-сі-ца зла-ві-ла Гусака і кажа: «Гусак, Гусак, я цябе з’ем!» Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, Лі́сачка. Толькі дазволь мне перад смерцю па-тан-ца-ваць».

Ліса а-дка-зва-е: «Танцуй сабе, а з’есці я цябе яшчэ паспею». Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пе-ра-сту-па́ць.



Глядзіць Ліса на Гусака і смяецца: «Вось дык Гусак! Вось дык танцор!»

А Гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу перастурпаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася Лісіца з ра-зяў-ле-ным ротам.

Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму засмуціўся Гусак?
2. Аб чым ён папрасіў Лісу? Прачытайце радкі, якімі можна падпісаць малюнак.
3. Якія якасці характару праявіў Гусак? Выберыце патрэбныя словы: *хітрасць, смеласць, разгубленасць, баязлівасць, разважлівасць*.
4. Прачытайце казку па ролях.

Прачытайце словы: *працавіты, злы, старанны, галодны, разважлівы, смелы*. Якія словы падыходзяць да апісання Вала, Ваўка?

За-ві-ха́-цца — старанна працаваць.
Па-дця́ў-шы хвасты́ — падкруціўшы хвасты.

## Хітры Вол

*Беларуская народная казка*

Пайшоў Вол сена касіць. Косіць, завіхаецца, на неба паглядае: ці не відаць адкуль хмары? «За пагоду, — думае, — сена насушу, стог скі́даю, тады і зіма не страшна». Ідзе Воўк. Загле́дзеўся на Вала.

— Ты Бык? — пытаецца.

— Не, я Вол.

— Сена косіш?


Правообладатель Национальный институт образования

— Кашу.
— Рагамі грабеш?
— Грабу.
— Хвастом падграбаеш?
— Падграбаю.
— А мяне ты не баішся?

Падумаў Вол і кажа:

— Я не толькі цябе, а і двух такіх не баюся!

Паверыў Воўк і пайшоў шукаць сабе падмогі. Прыходзіць на другі дзень з двума братамі.

— Ты Бык? — зноў пытаецца.



— Не, Вол.
— Сена косіш?
— Кашу.
— Рагамі грабеш?
— Грабу.
— Хвастом падграбаеш?
— Падграбаю.
— І трох нас ты таксама не баішся?

Што Валу рабіць? Давай ён далей хітрыць.

— Не толькі трох, — кажа, — а і чатырох не баюся.

Паверылі ваўкі і падалі́ся шукаць новых сяброў.

Правообладатель Национальный институт образования

Доўга шукалі. Нарэшце прыходзяць на балота цэлаю чарадою. Глядзяць, а там ужо стог сена стаіць і Вала не відаць.

Кінуліся ваўкі па следзе і прыбеглі да двара, дзе Вол жыў. Двор Вала высокім частаколам абгароджаны.

Круціліся, круціліся ваўкі, скакалі, скакалі, ды так да Вала і не дабраліся.

— Ага, — закрычалі яны са злосці, — ты, баязлівец, схітрыў!

— Схітрыў ці не схітрыў, — адказвае Вол, — а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася.

І павалакл́іся ваўкі прэч, хвасты падцяўшы.

1. Чым быў заняты Вол? Чаму ён спяшаўся?
2. Хто да яго прыйшоў? Які адказ даў Вол Ваўку?
3. Прачытайце, як паводзілі сябе ваўкі каля дома Вала. Што адказаў ім Вол?
4. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання казкі.
5. Прачытайце прымаўку. Каго з герояў прачытаных казак можна назваць смелым?

○ Смеламу перамога ідзе насустрач.


Правообладатель Национальный институт образования